пра мэтазгоднасць выдзялення трох стадый у развіцці літаратуры Адраджэння, пра неабходнасць уключэння ў агульнакультурны кантэкст шматмоўнай літаратуры некалькіх папярэдніх стагоддзяў і да т. п. У шэрагу матэрыялаў постсавецкага часу (як, напрыклад, у артыкулах «На парозе падагульнення», «У параметрах канцэптуальнага пераасэнсавання») А. Лойка з задавальненнем канстатаваў, што многія з узнятых ім і яго аднадумцамі пытанняў вырашаюцца.

Асаблівы гонар, боль і прадмет рэфлексавання А. Лойкі – гэта слоўнае мастацтва XX ст., творчыя набыткі, упушчэнні як пісьменнікаў-класікаў, так і сучасных аўтараў, нярэдка яго літаратурных равеснікаў, а то і вучняў. Зноў і зноў, не баючыся паўтарэнняў, аўтар шукае адказу на «праклятае» пытанне: як сталася, што крутыя зломы гісторыі аказаліся такімі неміласэрнымі ў дачыненні не толькі да людзей, але і да іх творчага плёну? Даследчык развенчвае калі не ўсе, то многія міфы сацрэалізму, яго «тры кіты» (П. Васючэнка), што мелі як тэарэтычную падаснову, так і негатыўныя практычныя вынікі. Сярод іншага ён адмаўляе т. зв. «рэвалюцыйную радасць» нашых першых народных паэтаў, праводзіць ідэю ўзвышэнства, новапарнаскасці, самакаштоўнасці літаратуры, прывіваючы тым самым эстэтычную плынь у мастацтве слова, тую плынь, якую на пачатку XX ст. сцвярджалі М. Багдановіч, Власт, Антон Навіна.

У тым, што айчынны літаратурны працэс, многія творчыя індывідуальнасці «адваяваны ад вульгарнага сацыялагізму, <…> ад сацрэалістычнай рэгламентацыі, ад дэмагогіі, якая палітызавала, дэгуманізавала, дээстэтызавала літаратуру, гвалцячы ў ёй як нацыянальныя, так і агульначалавечыя каштоўнасці» [1, с. 204], неацэнная заслуга аўтара «кнігі лёсаў» «Галгофа».

## Літаратура


1. *Лойка, А.* Галгофа : кніга лёсаў / А. Лойка. – Слонім : Слонім. друк., 2001. – 288 с.
2. *Рагойша, В.* Лінія жыцця / В. Рагойша // І адгукнецца слова ў слове… : літ.-крытыч. арт., эсэ, дыялогі. – Мінск, 1992. – С. 67–76.
3. *Тычко, Г.* Паэт у літаратуразнаўстве / Г. Тычко // Чалавек з сонечнаю ўсмешкай : кніга пра Алега Лойку ; рэдкал. : А. Бельскі (уклад.) і [інш.]. – Мінск, 2019. – С. 97–101.



*Н. В. Гурская (Беларусь)*


# АПОВЕСЦЬ «ПАЙСЦІ І НЕ ВЯРНУЦЦА» ВАСІЛЯ БЫКАВА: ПАЧУЦЦІ ПАД УПЛЫВАМ АБСТАВІН

Героям Васіля Быкава, што ўвайшоў у гісторыю беларускай і сусветнай літаратуры як праўдзівы летапісец Вялікай Айчыннай вайны, заўсёды даводзіцца

рабіць складаны выбар, спрабаваць застацца чалавекам у бесчалавечных абставінах. У напісаных у розны час аповесцях «Альпійская балада», «Трэцяя ракета», «Пайсці і не вярнуцца», «Пакахай мяне, салдацік» гэты выбар палягае ў сферы адносін «мужчына – жанчына», паміж якімі зарадзілася «мірнае» пачуццё закаханасці. Трагічныя ўмовы, аднак, ніколі не даюць развіцца гэтаму пачуццю, атрымаць працяг. У той жа час яны выяўляюць сапраўдную сутнасць герояў, іх маральнае аблічча.

Так, у аповесці «Пайсці і не вярнуцца» (1978) рамантычныя стасункі звязваюць партызан Зосю Нарэйку і Антона Галубіна.

Зося – дзяўчына, поўная энергіі і адвагі, якая без зброі і компаса рашуча ішла на заданне ў родныя мясціны. Яна, нібы дзіцё, палохалася шораху кожнай галінкі і гукаў начнога балота: «…У думках лаяла сябе за палахлівасць і ўсё ўгаворвала: ну, чаго ты баішся, дурніца, што ж тут можа быць страшнае?» [1, с. 266].

Дзяўчына нарадзілася ў Скідзелі, дзе засталася жыць яе маці. Думаецца, вобраз матулі не дарма выкарыстаны аўтарам: маці мае цесную сувязь з Радзімай. На працягу ўсяго твора Зоська ўспамінала сваю матулю. Вобраз маці ўзнікае і ў фінале, калі дзяўчына ўжо зусім абяссілена: «Мамачка, я не памру. Я не памру, мамачка…» [1, с. 412].

Зося Нарэйка, гераіня з чулай душой, з пяшчотай ставіцца да людзей. Так, яе агарнуў моцны жаль, калі яна даведалася, што партызан Петракоў хварэе на сухоты: «Зоська збянтэжылася. Яна не ведала, што ў такіх выпадках можна сказаць чалавеку, чым суцешыць яго. Ды і ці трэба суцяшаць наогул?» [1, с. 282]. Але больш яскравым прыкладам яе дабрыні з'яўляецца момант, калі дзяўчына сваім рашэннем уратавала жыццё Антона, не прызнаўшыся, што ён надумаў перайсці да немцаў: «Абсівераныя Зосьчыны вусны ўздрыгнулі, і, быццам баючыся, што не паспее, яна прамовіла:

– Ладна, не трэба. Ён свой...» [1, с. 379].

«Усмешлівая і зваблівая, нібы штосьці абяцала і падманьвала адначасова» [1, с. 282], так лаканічна аўтар апісвае дзяўчыну, лёгкую і прывабную, з «блакітнымі, васільковымі вачамі». Справядлівасць, сумленнасць і адданасць справе – словы, якія выдатна характарызуюць партызанку. Нягледзячы на сур'ёзнае становішча, у якім яна апынулася праз Антона, Зося ўсё роўна турбавалася пра тое, каб выканаць заданне: «…Непакой за нявыкананае заданне ахапіў яе з новаю сілай, яна ледзьве перамагла ў сабе нецярплівасць <…>» [1, с. 380].

Чалавечная Зоська апынулася ў бесчалавечных абставінах. Закаханая ў Антона, яна не хоча паверыць у яго здраду, да апошняга спадзяецца, што гэта жарт: «Ты гэта пажартаваў? Пажартаваў жа, праўда? – І адхінулася, далікатна, але настойліва вызваляючыся з ягоных рук» [1, с. 335]. Як бы юная партызанка ні любіла жыццё, яна ніколі не змагла б пайсці супраць свайго сумлення: «Каму жыць не хочацца? Я ж зусім і не жыла яшчэ, можна сказаць. Але што ж ты прапануеш? Ісці да фашыстаў? Што ж гэта такое? Гэта ж горш, чым нават смерць. Тут трэба згубіць сумленне. Яны ж чума дваццатага стагоддзя. Супраць іх увесь свет. З імі ж жыць немагчыма, яны ж звяры» [1, с. 336].

Далікатная і спакойная дзяўчына, не падрыхтаваная да ўсіх складанасцей вайны, змагла знайсці ўнутры сябе моц і адвагу, змагла духоўна перамагчы і ўратаваць сябе. Параненая Антонам, Зоська паўзла, амаль не адчуваючы свайго цела. Рана гэта была не толькі фізічная, але і маральная – боль і крыўда трапілі ў самае сэрца. Апісанне таго, як Зося змагаецца з болем, як упарта імкнецца дабрацца да людзей, сведчыць пра духоўную сілу дзяўчыны, яе жаданне жыць, прычым жыць сумленна: «Яна паўзла доўга, амаль цэлую вечнасць, раз-пораз губляючы памяць. Часам удары болю з такой лютай ярасцю праціналі яе бок і спіну, што яна знямогла замірала на месцы, доўга не адважваючыся варухнуць ні рукой, ні нагой» [1, с. 336].

Увесь гэты жах і боль у жыццё Зосі Нарэйка прынёс партызан Антон Галубін. Прыгожы малады мужчына, у якога цяжка было не закахацца, пераўтварыўся ў сапраўднага д'ябла.

Галубін – вопытны вайсковец, што да пэўнай пары мужна і адказна выконваў усе даручэнні, выдатна разбіраўся ў геаграфіі, добра арыентаваўся на мясцовасці. Нягледзячы на «чорную паласу» (няўдалыя аперацыі), партызан не надта сумаваў ад гэтага, бо «па натуры быў чалавек з характарам, вытрымкі ў яго хапала» [1, с. 280].

Адным з першых сігналаў аб душэўнай скупасці і схільнасці Антона да здрады быў момант, калі кемлівы і хітры Галубін ўратаваў чацвярых, але камандзіра, якога ён так любіў, пакінуў гінуць у адзіноце, па сутнасці, вырашыўшы яго лёс. Сам Антон быў камандзірам падрыўнікоў, але неўзабаве яго панізілі да радавога. Ваганні з'явіліся ў душы партызана, калі ён дазнаўся пра цяжкае становішча нашых войск пад Сталінградам: «Тады нашто яны тут, у гэтым лесе? Што ім тут рабіць? І што іх чакае ў хуткім будучым?

<…> Усё гэта трывожыла і гняло штодзень, душа ныла ў трывожнай самоце на заданнях, у будане, усе сцюдзёныя дні і ночы гэтай позняй дажджлівай восені» [1, с. 280].

Шчыры і ласкавы чалавек, мужчына, за якім Зоська адчувала сябе як за каменнай сцяной, пра якога думала з такой лагоднасцю («Усё ж гэта прыемна, калі за цябе нехта трывожыцца, перажывае і нават гатовы памагчы. Тут, напэўна, ужо не проста таварыскасць і не сяброўства нават, а, мабыць, і нешта большае. Можа, нават каханне... Усё ж ён слаўны, гэты Антон Галубін…» [1, с. 283]), аказаўся баязліўцам і здраднікам. Намеры Галубіна не маглі супасці з поглядамі Зосі Нарэйка.

Упэўнены ва ўласнай харызме, ён хацеў нахабна выкарыстаць наіўнасць дзяўчыны: «Яшчэ ніводная дзеўка, на якую ён кідаў вокам, не грэбавала ім, Антон ведаў сілу сваёй прывабнасці і ўмеў пакарыстацца ёю, калі толькі гэта было яму трэба. Цяпер Зоська стала яму надта патрэбнай, і Антон спадзяваўся, што калі пастараецца, дык усё задуманае ім збудзецца» [1, с. 314].

Урэшце, яго планам не суджана было збыцца, і тады Антон паказаў сваю сапраўдную – звярыную – сутнасць. Зробленае Антонам ніяк не суадносіцца з «каханнем», пра якое ён гаварыў Зосьцы. Галубін жорстка абышоўся з дзяўчынай дзеля ўратавання ўласнага жыцця: ударыў і звязаў, а затым прыкідваўся

невінаватым, гаворачы, што Зося здрадніца («Гэта безабразіе, сяржант! Мала што наган адабралі, дык яшчэ і вязаць! За што? Што гэта сказала? І вы ёй паверылі? Можа, у мяне з ёй асобныя шчоты?» [1, с. 369]). Але наступныя дзеянні абсалютна дакладна пацвярджаюць маладушнасць Антона: ён з лёгкасцю змог выстраліць у Зосю, у чалавека, якому толькі нядаўна казаў пра каханне.

Нягледзячы на моцны фізічны і духоўны ўдар, Зоська змагла разгледзець сапраўднага Антона: «Прадаць, ашукаць, наздзекавацца яму нічога не варта, бо для яго не існуе маральных законаў, ён заўжды будзе такі, якім яго павернуць абставіны. А абставіны на вайне – рэч дужа зменлівая, і такі ж зменлівы паміж іх будзе Галубін» [1, с. 399].

«Нельга ісці супраць сумлення, нельга ісці супраць сваіх» [1, с. 399] – гэта тое, што Антон Галубін не змог засвоіць. Словы пра каханне ён выкарыстоўваў як сродак маніпуляцыі, як спосаб дамагчыся сваіх злачынных мэт. Зоська не паддалася ўгаворам, не адступіла ад сваіх прынцыпаў нават пад пагрозай смерці. Адкрыты фінал дазваляе спадзявацца на лепшае ў лёсе дзяўчыны. У тым ліку і на сапраўднае каханне.

## Літаратура

1. *Быкаў, В.* Пайсці і не вярнуцца : аповесць / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 415 с.

*Т. В. Данилович (Беларусь)*

# ОСМЫСЛЕНИЕ КОНЦЕПЦИИ ЧИСТОГО ИСКУССТВА В РУССКОЙ ЛИТЕРАТУРНОЙ КРИТИКЕ СОВЕТСКОЙ ЭПОХИ

На протяжении длительного времени в советском обществе концепция чистого искусства подвергалась порицанию. При этом на разных этапах развития русской литературной критики в СССР возникали свои нюансы рецепции принципов «искусства для искусства».

В 1920-е гг. эта тема приобрела актуальность в связи с обсуждением вопроса о направлении развития советской литературы. Царившая в то время атмосфера литературных дискуссий позволила открыто выразить собственные эстетические взгляды и адептам, и противникам чистого искусства.

В послереволюционном обществе наиболее распространенным объектом критики сторонников суверенности искусства оказывается политизированный взгляд на литературу, точка зрения, что произведения искусства уже благодаря их созвучности эпохе могут быть объектом одобрения. Идеологическому критерию